СЁЛЕТА 24 ЧЭРВЕНЯ К. ЧОРНАМУ СПОЎНІЛАСЯ Б 95.

# ІМЯ І ЖЫЦЦЁ, НІБЫ ЗОРКА

Кузьма Чорны пражыў кароткае, цяжкае, але яркае, як зорка на небасхіле, жыццё. Ён рос і гадаваўся сярод простых людзей фізічнай працы, для якіх кавалак хлеба і палатняная кашуля адна на год лічылася вялікім шчасцем. З гэтымі людзьмі ён быў звязаны ўсім сваім жыццём і творчасцю.

У 1923 годзе на старонках газеты «Савецкая Беларусь» з'явілася яго першае апавяданне «На граніцы». І падпісана яно было таксама ўпершыню псеўданімам Кузьма Чорны. Пасля былі «Будзем жыць», «Ноч пры дарозе», «Максімка» і іншыя апавяданні. Затым —зборнікі, раманы, артыкулы і пераклады...

Беларускі народ памятае свайго вялікага пісьменніка і гэту памяць ушаноўвае. Добрым помнікам з'яўляюцца тыя ўрачыстасці, што праводзяцца ў Цімкавічах з выпадку святкавання яго юбілеяў, і музей.

Дарэчы, уражанні ад наведвання нашага музея ў тых, хто прыйшоў сюды па свайму жаданню ці запрашэнню — самыя хвалюючыя і незабыўныя. Аб гэтым сведчаць і запісы, пакінутыя ў кнізе водгукаў. «Мы выходим из музея

## Юбілеі

окрылёнными, с таким чувством, будто бы прикоснулись к чему-то светлому, чистому», — напісалі вучні школы № 4 г. Нясвіжа. А жыхар Санкт-Пецярбурга выказаўся так: «Очень рад, что память нашего земляка сохраняется и приумножается его потомками. Попадаешь как бы в другой мир, чуешь дух прежних времён. От этого легче. Обретаешь покой».

Адна жанчына з Цімкавіч, наведаўшы музей, сказала: «Так лёгка стала на душы, быццам бы пабывала ў царкве на споведзі». Наведвальнік з Клецкага раёна заклікаў: «Земляне, вы храните память о нём, он для нас очень дорог».

У творчасці многіх сённяшніх пісьменнікаў бачацца яго ўрокі прозы, яго запавет, яго вопыт. Кожнаму з іх лягчэй, спраўней, смялей працаваць на той ніве, на якой так старанна, рупліва і самаахвярна пашчыраваў ён, вялікі Кузьма Чорны.

Шаноўныя жыхары нашага горада і раёна, госці Капыльшчыны! Аматары роднага слова і ўсе жадаючыя! Запрашаем вас на ўрачыстасці ў Цімкавічы, прысвечаныя юбілею пісьменніка. Мерапрыемствы праводзяцца сёння, 24 чэрвеня. Пачатак у 15.00.

**Людміла НІЖЭВІЧ,**
дырэктар дзяржаўнага музея К. Чорнага ў Цімкавічах.